**ПАЛАЖЭННЕ**
**КОНКУРСУ-ФЕСТЫВАЛЮ**
**СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ**
***DRAMATYZACYJA***

**З 5 снежня да 20 студзеня 2026 года адкрыты прыём п’ес на Конкурс-фестываль сучаснай беларускай драматургіі *Dramatyzacyja*! У гэтым годзе конкурс праходзіць у Польшчы.**

## I. АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ:

1.1. Конкурс-фестываль сучаснай беларускай драматургіі *Dramatyzacyja* (далей у тэксце – Конкурс) – гэта незалежны праект, які аб’ядноўвае беларускіх драматургаў, рэжысёраў, акцёраў, тэатральных крытыкаў і дзеячаў тэатра з мэтай аналізу стану беларускай драматургіі, вызначэння пераможцаў Конкурсу, выяўлення новых Аўтараў і таленавітых п’ес.
1.2. Палажэннем аб Конкурсе вызначаецца парадак падрыхтоўкі і правядзення дадзенага конкурсу.
1.3. Арганізацыйным камітэмам (далей у тэксце – Аргкамітэт) Конкурсу выступае Беларускі інстытут тэатра (далей у тэксце – БІТ).
1.4. Конкурс праводзіцца адзін раз на два гады. Тэрыторыя правядзення Конкурсу вызначаецца Аргкамітэтам..

## II. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ:

2.1 Мэта Конкурсу – вызначэнне найлепшай беларускай п’есы, што пасадзейнічае развіццю беларускай драматургіі і фарміраванню ўмоў для прафесійнага развіцця беларускіх аўтараў.
2.2. Задачы Конкурсу:
2.1.1. Збор, сістэматызацыя і захаванне драматургічных тэкстаў.
2.1.2. Даследаванне тэндэнцый і прэзентацыя асаблівасцяў беларускай драматургіі, выяўленне найбольш цікавых тэкстаў.
2.1.3. Папулярызацыя сучаснай беларускай драматургіі – прыцягненне ўвагі да драматургіі, актуальных тэм, якія хвалююць грамадства як унутры краіны, так і за яе межамі.
2.1.4. Стварэнне платформы для дыялогу – аб’яднанне тэатральнай супольнасці як у Беларусі, так і за яе межамі, якое садзейнічае абмену ідэямі і вопытам.
2.1.5. Асвятленне актуальных пытанняў – Конкурс дае магчымасць публічна азнаёміцца з п’есамі Аўтараў на значныя сацыяльныя, культурныя і палітычныя тэмы, тым самым спрыяючы грамадскаму дыялогу.

## III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў КОНКУРСЕ:

3.1. У Конкурсе могуць прымаць удзел аўтары, якія ідэнтыфікуюць сябе як беларускія драматургі.
3.2. Да разгляду прымаюцца драматургічныя тэксты, напісаныя з 2020 па 2025 год уключна.
3.3 П’еса павінна быць напісана на беларускай,рускай мовах, або на мове той краіны, дзе праводзіцца конкурс. Таксама прымаецца пераклад з мовы арыгінала на любую з гэтых трох моў.
3.4. П’есы, якія раней прымалі ўдзел у Конкурсе *Dramatyzacyja*, да ўдзелу не прымаюцца.
3.5. Ад аднаго Аўтара прымаецца любая колькасць п’ес, якія падыходзяць пад вышэйазначаныя ўмовы.
3.6. Конкурс-фестываль грунтуецца на дэмакратычных каштоўнасцях, паважаючы правы чалавека, рознасць меркаванняў, роўнасць, справядлівасць, свабоду выказванняў і слова, годнасць чалавека. Не прымаюцца да разгляду працы Аўтараў, адказных ці іншым чынам спрыялых прапагандзе вайны, распальванню варожасці, парушэнню правоў чалавека, ці падтрыманню агрэсіі РФ супраць Украіны.
3.7. З удзелу ў конкурсе Прэміі выключаюцца п’есы, аўтарамі ці суаўтарамі якіх з’яўляюцца сябры БІТ, Журы Конкурсу (далей у тэксце – Журы), Каардынатар Конкурсу (далей у тэксце – Каардынатар) і/ці асобы, якія маюць дачыненне да падліку галасоў, а таксама асобы, якія маюць дачыненне да кантрольна-рэвізійных органаў арганізатараў.
3.8. У выпадках, калі ёсць сумневы наконт допуску п’есы, Каардынатар можа звярнуцца да Журы, якое вырашыць, ці адпавядае п’еса патрабаванням, прапісаным у Палажэнні.

ЭТАПЫ КОНКУРСУ:

4.1 Конкурс праводзіцца ў некалькі этапаў:
Першы этап: прыём заявак (дасланых драматургічных тэкстаў) і верыфікацыя іх Аўтараў Аргкамітэтам.
Другі этап: ацэньванне Журы дасланых п’ес, складанне лонг- і шорт- лістоў Конкурсу публічнае абвяшчэнне лонг-ліста Конкурсу..
Трэці этап: фестывальная частка з правядзеннем перфарматыўных чытанняў і абмеркаванне п’ес, якія ўвайшлі ў шорт-ліст Конкурсу, узнагароджанне пераможцаў Конкурсу падчас урачыстай цырымоніі.
4.2. Назва п’есы і імя аўтара да абвяшчэння вынікаў будуць зашыфраваны.
4.3. Пасля абвяшчэння вынікаў рашэннем Аргкамітэта дзеля бяспекі Аўтара яго сапраўднаен імя можа не раскрывацца публічна.
4.4. Рашэннем Аргкамітэта імя сябра Журы можа быць зашыфравана дзеля яго бяспекі.

## V. АРГКАМІТЭТ ПРЭМІІ

5.1. Аргкамітэт складаецца з сябраў БІТ (або з прадстаўнікоў іншых арганізацый, дэлегаваных у Аргкамітэт).
5.2. Аргкамітэт прызначае Каардынатара – асобу, якая каардынуе ўвесь конкурсны працэс і працу Журы ў шчыльнай супрацы з Аргкамітэтам. У некаторых выпадках пасада і абавязкі Каардынатара могуць быць падзелены паміж некалькімі асобамі.
5.3. Каардынатар арганізоўвае і праводзіць паседжанні падчас Конкурсу.
5.4. Каардынатар не мае права голасу пры выбары пераможцы Конкурсу.

5.5. Аргкамітэт прымае рашэнні на падставе Палажэння. Наконт пытанняў, не ўрэгуляваных Палажэннем, Аргкамітэт прымае рашэнні, кіруючыся прынцыпам слушнасці, характарам Конкурсу і яго мэтай і задачамі.
5.6. Склад Аргкамітэта можа пашырацца. Новых кандыдатаў у сябры Аргкамітэта могуць прапаноўваць дзейныя сябры Аргкамітэта. Новыя сябры Аргкамітэта прымаюцца простай большасцю галасоў.
5.7. Сяброўства арганізацыі ў Аргкамітэце можа быць прыпынена паводле ўласнага жадання або ў выпадку абгрунтаванага рашэння Аргкамітэта (рашэнне аб гэтым прымаецца не менш чым ⅔ галасоў ад агульнага колькаснага складу Аргкамітэта).
5.8. Сябры Аргкамітэта абавязаны захоўваць у таямніцы пытанні ходу паседжанняў і галасавання Журы.

## VI. ЖУРЫ КОНКУРСУ:

6.1. Колькасць сябраў Журы: 5 чалавек.
6.2. Журы фарміруецца з прафесійных беларускіх і замежных драматургаў, тэатразнаўцаў, рэжысёраў і тэатральных крытыкаў.
6.3. Сябры Журы прызначаюцца Аргкамітэтам.
6.4. Працу Журы курыруе Каардынатар у шчыльнай супрацы з Аргкамітэтам.
6.5. Сяброўства ў Журы заканчваецца а) з уручэннем узнагароды, б) калі сябра Журы не мае фізічнай магчымасці выконваць свае абавязкі далей, в) у выніку парушэння Палажэння Конкурсу. У гэтым выпадку Аргкамітэт можа прызначыць новага сябра Журы, г) калі сябра Журы падае афіцыйную пісьмовую адмову на адрас Аргкамітэта.

## VII. ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ СЯБРАЎ ЖУРЫ КОНКУРСУ:

7.1. Сябры Журы абавязаны прачытаць усе п’есы, прынятыя да ўдзелу ў Конкурсе. Тэксты п’ес атрымоўваюць без прозвішчаў Аўтараў.
7.2. Сябры Журы абавязаны прысутнічаць на паседжаннях Журы. Прысутнасць сябраў Журы на паседжаннях Журы ў абгрунтаваных выпадках можа адбывацца ў фармаце анлайн. У выключных выпадках сябра Журы, які не мае магчымасці прыняць удзел у паседжанні, можа пісьмова даць Каардынатару свае прапановы, у адпаведнасці з мэтай і прадметам гэтага паседжання.
7.3. Кожны з сябраў Журы абавязаны зацвердзіць лонг- і шорт-лісты п’ес, якія прэтэндуюць на званне пераможцаў Конкурсу ў адпаведнасці з працэдурамі, прынятымі Палажэннем.
7.4. Сябры Журы абавязаны захоўваць у таямніцы пытанні ходу паседжанняў, галасаванняў і абмеркаванняў. Сябры Журы абавязаны захоўваць у таямніцы прынятыя падчас паседжанняў рашэнні да моманту іх афіцыйнага абвяшчэння.
7.5. Сябры Журы абавязаны не перадаваць нікому перасланых ім электронных версій п’ес, пададзеных на Конкурс.
7.6. Сябры Журы прымаюць рашэнні на паседжаннях на падставе Палажэння.
7.7. Паводле пытанняў, не ўрэгуляваных Палажэннем, Журы прымае рашэнні згодна з уласным меркаваннем, кіруючыся прынцыпамі слушнасці, характарам Конкурсу і яго мэтай і задачамі. У выпадку, калі рашэнне Журы відавочна пярэчыць Палажэнню, Аргкамітэт можа скасаваць рашэнне Журы.

7.8. Абмеркаванні Журы падчас паседжанняў і прынятыя рашэнні фіксуюцца ў пратаколах паседжанняў.
7.9. Для вырашэння спрэчных пытанняў сябры Журы могуць ініцыяваць скліканне дадатковага паседжання Журы і прадстаўнікоў Аргкамітэта. За прыняцце рашэння пра дадатковае паседжанне мусяць прагаласаваць мінімум двое сябраў Журы.
7.10. Паседжанні Журы могуць запісвацца ў аўдыя- ці відэафармаце для патрэб складання пратакола, а таксама для архіва БІТ.

## VIII. МЕХАНІЗМ ФАРМАВАННЯ ЛОНГ- І ШОРТ-ЛІСТОЎ І ВЫЗНАЧЭННЯ П’ЕСЫ-ПЕРАМОЖЦЫ:

8.1. Кожны сябра Журы незалежна адзін ад аднаго фармуе свой лонг-ліст (10 п’ес) і шорт-ліст (лепшыя 5 п’ес з лонг-ліста) Конкурсу з дасланых на Конкурс п’ес.
8.2. Кожная з п’ес, абраных сябрам Журы, атрымлівае адзін бал.
8.3. П’есы, якія набралі больш за ўсё балаў, складаюць фінальны лонг-ліст (10 п’ес).
8.4. Калі некалькі п’ес набіраюць аднолькавую колькасць балаў, то наконт іх праводзіцца дадатковае абмеркаванне і галасаванне. Кожны з сябраў Журы мае адзін голас, які аддаецца за адну з п’ес, што прэтэндуюць на месца ў фінальным лонг-лісце.
8.5. Журы збіраецца на адкрытае паседжанне, дзе вызначаецца фінальны шорт-ліст Конкурсу (5 п’ес) і п’еса-пераможца Конкурсу.
8.6. П’еса-пераможца Конкурсу абіраецца з фінальнага шорт-ліста Журы адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў.
8.7. Кожны сябра Журы абавязаны падпісаць выпіску з пратакола фінальнага паседжання, альбо дэкларуюць свой подпіс анлайн.
8.8. Канчатковыя вынікі (спіс аўтараў і назваў п’ес, якія ўвайшлі ў лонг- і шорт-ліст) друкуюцца на старонках БІТ ў сацыяльных сетках не пазней 10 каляндарных дзён пасля фінальнага галасавання Журы.
8.9. П’есы, дасланыя на Конкурс, не рэцэнзуюцца.

## IX. АЎТАРСКІЯ ПРАВЫ:

9.1. Усе аўтарскія правы на дасланыя творы захоўваюцца за Аўтарамі. Любое выкарыстанне п’ес Аргкамітэтам і/ці іншымі асобамі, патрабуе спецыяльнай дамоўленасці з Аўтарам або яго прадстаўніком і немагчыма без яго згоды.
9.2. Выкарыстанне п’есы ў межах Конкурсу ўключае стварэнне чыткі п’есы ў выпадку адбору твора ў шорт-ліст Конкурсу.
9.3. У выпадку адбору п’есы ў лонг- і шорт-лісты Конкурсу тэкст друкуецца на старонцы Конкурсу. П’еса друкуецца на мове арыгінала; анатацыя і фрагмент – на англійскай мове.
9.4. П’есы, якія ўвайшлі ў шорт-ліст, дадаткова друкуюцца і на мове краіны правядзення Конкурсу.
9.5. Факт адпраўкі п’есы на Конкурс пацвярджае згоду Аўтара на выкарыстанне яе ў межах Конкурсу.

## X. УЗНАГАРОДЖАННЕ:

10.1. Усе Аўтары, п’есы якіх увайшлі ў лонг-ліст Конкурсу, атрымліваюць дыпломы лаўрэатаў Конкурсу, дзе адзначаецца іх удзел і ўваходджанне ў лонг-ліст.
10.2. Аўтары, п’есы якіх увайшлі ў шорт-ліст (за выключэннем пераможцы), атрымліваюць сертыфікаты, дзе адзначаецца ўдзел у Конкурсе і ўваходджанне ў шорт-ліст Конкурсу, а таксама ўзнагароду ў памеры 200 еўра.
10.3. П’есы, якія ўвайшлі ў шорт-ліст Конкурсу, а таксама п’еса-пераможца, пераводзяцца на мову краіны правядзення Конкурсу.
10.4. Аўтар п’есы, якая перамагла, атрымлівае фінансавую ўзнагароду у памеры 1000 еўра.
10.5. П’есы, якія ўвайшлі ў шорт-ліст, будуць пастаўлены ў фармаце сцэнічных чытанняў падчас Конкурсу-фестывалю (далей па тэксце - Фестывалю).

## XI. МЕХАНІЗМ ПРАВЯДЗЕННЯ СЦЭНІЧНЫХ ЧЫТАННЯЎ:

11.1. Аргкамітэт шляхам адкрытага колу прапануе п’есы, якія ўвайшлі ў шорт-ліст, рэжысёрам з іх творчымі камандамі для пастаноўкі сцэнічных чытанняў.
11.2. Аргкамітэт пакідае за сабой канчатковы выбар каманд чытанняў, згодна з мэтай і задачамі Фестывалю.
11.3. Прыярытэт аддаецца камандам, у складзе якіх ёсць беларускія ўдзельнікі.
11.4. Рэжысёр чытання самастойна выбірае каманду.
11.5. Каманда самастойна выбірае мову, на якой адбудзецца сцэнічнае чытанне (мова арыгінала ці мова краіны правядзення Конкурсу). Выбар мовы абмяркоўваецца з Аўтарам.
11.6. Каманды чытанняў атрымліваюць бюджэт на правядзенне сцэнічнага чытання (1000 еўра на 1 тэкст).
11.7. Аргкамітэт аплочвае праезд і пражыванне каманды на перыяд правядзення Фестывалю.
11.8. Рэпетыцыйная пляцоўка для падрыхтоўкі чытання прадастаўляецца непасрэдна перад паказам чытання на Фестывалі.
11.9.Пляцоўка не прадстаўляецца на тэрмін падрыхтоўкі чытання

## XII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ:

12.1. Змены ў Палажэнне уносяцца і зацвярджаюцца Аргкамітэтам. Палажэнне пачынае дзейнічаць з даты зацвярджэння яго Аргкамітэтам.